•травень • 2010 •

# MAkAsIN




## ТАЙМ ФОР ЯНГ РЕСЕРЧЕР

*Сам факт, что событие стало ежегодным – греет душу. Но является ли этот факт прямым доказательством того, что уровень знания английского среди студентов достаточен…*

стар.4

## ПЕРШАМАЙ – БАРАЦЬБА ЗА ПРАЦУ

*…Судовы фарс, які адбыўся некалькі месяцаў пасля, увайшоў у гісторыю як адна з ганебных плямаў на твары амерыканскага правасуддзя.*

стар.5

## ПРИВЕТСТВУЕМ ВАС, ЛЮДИ БУДУЩЕГО!

*«Если мы не наделаем глупостей, то будем существовать и более 50 тысяч лет, ведь это всего-навсего 1 % от всего срока жизни человечества на планете»*

стар.7

## INFO

• Кандыдат у дэпутаты Франак Вячорка сцвярджае, што на яго ўчастку сябрамі камісіі былі падкінутыя фальшывыя бюлетэні.

• Міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» пратэстуюць супрацьператрусаў у журналістаў і намерам уладаў зламаць іх пошту і Skype-перапіску.

• Вядомая дэмакратка, Валерыя Навадворская, упэўненая, што Захад павінен уводзіць санкцыі супраць недэмакратычных рэжымаў.

• У Бабруйскім раёне двух чалавек забіла маланкай.

• Беларускі манапаліст сувязі заняў першае месца ў галіне сувязі па выкананні асноўных мэтавых паказчыкаў «прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця».

• Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 красавіка 2010 г. склаў эквівалент 33,503 трыльёна беларускіх рублёў.

• Палітык Алесь Міхалевіч ужо не сябар Рады руху «За свабоду». Ён выключаны рашэннем Савета руху «За свабоду». Праўда, па ўласнай ініцыятыве.

• Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі, паводле звестак гандлёвага балансу, за студзень-сакавік 2010 склала 1 млрд. 236,3 млн. даляраў.

• У наваполацкім аўтобусе «заяц» адкрыў стральбу.

• Лідэр руху «За свабоду» Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што будзе ўдзельнічаць у наступных выбарах прэзыдэнта. Ён заявіў пра гатовасьць не толькі да выбараў, але і да вулічнага пратэсту: «Калі няма дэмакратыі на ўчастках для галасаваньня, то дэмакратыя рэалізуецца на вуліцы».

• Праваабарончая арганізацыя «Рэпарцёры бяз межаў» з Парыжу агучыла свой традыцыйны сьпіс 40 найгоршых ворагаў прэсы (predators of the press). Традыцыйна ўжо ў гэтым сьпісе апынуўся Аляксандар Лукашэнка.

• Беларускія прадпрыемствы нафтахімічнай галіны не задаволеныя тымі ўмовамі імпарту нафтапрадуктаў з Расеі, што існуюць цяпер.

*www.charter97.org*
*www.svaboda.org*

## НАВУЧАНЬНЕ ПА ПРАГРАМЕ «МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫЯ ДАСЬЛЕДВАНЬНІ УСХОДНЯЙ ЭЎРОПЫ»

***Абвяшчаецца набор на 2-гадовую магістарскую праграму «Міждысцыплінарныя дасьледваньні Усходняй Эўропы» (Interdisciplinary Research and Studies on Eastern Europe).***

**П**раграма ладзіцца ўнівэрсітэтам Балёніі (Італія) ды ўнівэрсітэтамі-партнэрамі ў Славакіі й Літве.

Да ўдзелу запрашаюцца асобы, якія атрымалі вышэйшую адукацыю ў галінах права, эканомікі, сацыялёгіі, міжнародных адносінаў, лінгвістыкі (асабліва славянскія мовы), паліталёгіі, гісторыі ды інш.

Праграма навучаньня будзе засяроджаная на разглядзе разьвіцьця пост-сацыялістычных краінаў ды іх інтэграцыі ў Эўразьвяз. Усё навучаньне будзе праходзіць на ангельскай мове. Удзельнікам будуць такса-ма прапанаваныя курсы па вывучэньні іншых замежных моваў (басьнійскай, сэрбскай, харвацкай, баўгарскай, славацкай, італійскай).

Больш падрабязная інфармацыя, усе дакумэнты ды форма заяўкі – па спасылцы: **www.mirees.unibo.it/call_for_application**.

Апошні тэрмін падачы заявак: **17 траўня 2010 г**.

З пытаньнямі зьвяртайцеся па адрасе: **info.spfo@unibo.it**

***Паводле рассылкі belngo.info***

## ЛЕТНІЯ ШКОЛЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА ДЛЯ МОЛАДЗІ Ў ВІЛЬНІ

***Беларуская праваабарончая школа, арганізаваная міжнароднай супольнасьцю праваабарончых арганізацыяў, абвяшчае конкурс на ўдзел у Летніх школах па правах чалавека на 2010 год.***

**У** межах праграмы Школы ўдзельнікі азнаёмяцца зь гісторыяй і філязофіяй правоў чалавека, а таксама сродкамі іх абароны на нацыянальным і міжнародным узроўнях.

Выкладчыкамі Школы будуць прадстаўнікі вядучых праваабарончых арганізацыяў Беларусі ды іншых краінаў, вядомыя й аўтарытэтныя спэцыялісты ў галіне правоў чалавека й права.

Месца правядзеньня: Літва, г.Вільня. Працоўныя мовы: беларуская ды расейская.

Тэрміны правядзеньня летніх Школаў па правах чалавека:

**Школа 1:** 2–10 ліпеня (заяўкі прымаюцца да 6 чэрвеня ўключна).
**Школа 2:** 11–19 ліпеня (заяўкі прымаюцца да 13 чэрвеня ўключна).
**Школа 3:** 23–31 ліпеня (заяўкі прымаюцца да 20 чэрвеня ўключна).
**Школа 4:** 1–9 жніўня (заяўкі прымаюцца да 27 чэрвеня ўключна).

Удзел у занятках і навучальныя матэрыялы бясплатныя. Арганізатары кампэнсуюць выдаткі на аплату візаў і страхавых полісаў, праезд, пражываньне й харчаваньне ўдзельнікаў.

Да ўдзелу запрашаецца беларуская моладзь, зацікаўленая ў набыцьці ведаў у галіне правоў чалавека (узрост: ад 18 да 25 год). Кожная група будзе сфармаваная з 18-22 удзельнікаў.

Каб прыняць удзел, неабходна запоўніць рэгістрацыйную форму, якая знаходзіцца па спасылцы: http://spring96.org/be/note/33867/ і даслаць яе не пазьней за вызначаны тэрмін на электронны адрас: belschool@gmail.com. Пажадана прадставіць рэкамэндацыйны ліст ад праваабарончай ці іншай грамадзкай арганізацыі, зь якой супрацоўнічае кандыдат, зь месца працы ці вучобы.

Пра вынікі конкурсу ўсе прэтэндэнты будуць праінфармаваныя цягам трох дзён пасьля заканчэньня адбору.

**УВАГА! ПАТРАБАВАНЬНІ ДА ПАШПАРТОЎ:** тэрмін дзеяньня пашпартоў прэтэндэнтаў мусіць быць на 3 месяцы болей, чым тэрмін заканчэньня адпаведнай Школы; у пашпарце мусяць быць дзьве чыстыя старонкі з адзнакай «візы»; пашпарт мусіць быць выдадзены цягам апошніх 10 гадоў.

З дадатковымі пытаньнямі зьвяртайцеся да Тацяны Рэвяка па адрасе: belschool@gmail.com

***Паводле рассылкі belngo.info***
***Паводле spring96.org***

## Мы говорим на английском – или на подобии английского?

***На международных конгрессах или конференциях, где главная задача участников – понять друг друга, языком общения становится английский или, в большинстве случаев, его подобие.***

**Б**ывший глава отдела маркетинговой стратегии IBM Жан-Поль Нерьер решил запатентовать придуманное им слово «глобалийский» («globish» – от «global» и «english») как обозначение универсального инструмента понимания. С технической точки зрения это английский с упрощенной структурой и словарным запасом примерно в 1,5 тысячи слов.

Система, созданная Нерьером, получила признание даже в англосаксонском мире. По мнению литературного редактора британской газеты The Observer Роберта Маккрама, «глобалийский» – что-то вроде диалекта XXI века, истоки которого – в изменении международного геополитического сознания.

Специалист по фонетике Том Физельман считает, что «глобалийский» способствует нормализации общения и удовлетворяет лингвистические потребности всего мира». Нерьер тоже подчеркивает, что акцент или особенности произношения не должны становиться препятствием для общения. Он на собственном опыте убедился, что лучше всего деловые переговоры проходили между китайцами и другими неанглоговорящими нациями.

## Сила бренда

***Аналитики британской исследовательской компании Millward Brown Optimor (MBO) уже в пятый раз составили для газеты Financial Times рейтинг самых дорогих брендов мира BrandZ Top-100.***

**Г**лавным фактором в оценке бренда стала его известность среди потребителей – более одного миллиона человек оценивали тысячи крупнейших брендов. На конечный результат также повлияли финансовые показатели компаний.

В 2010 году, впрочем, лидер рейтинга не преподнес никаких сюрпризов. Первое место, как и в прошлые три года, прочно закрепилось за самой популярной поисковой системой Google. Стоимость американского бренда аналитики MBO оценили в 114,26 миллиарда долларов.

Популярность поисковика Google, созданного в 1998 году студентами Стэнфордского университета, растет год от года. Google с огромным отрывом лидирует по количеству поисковых запросов по всему миру. По данным исследовательской компании Net Applications на март 2010 года, доля Google в глобальном интернете составила 85,74 процента. Его ближайший конкурент Yahoo! смог набрать лишь 6,09 процента.

В тройку самых дорогих мировых брендов также попали американские IBM и Apple. Стоимость этих брендов за год увеличилась на 30 и 32 процента соответственно. Торговую марку IBM аналитики оценили в 86,383 миллиарда долларов, а Apple – в 83,153 миллиарда.

## Белорусские агрогородки в Венесуэле «раскрутят» в информационных классах

***Агрогородки для Венесуэлы являются «инновационным продуктом, поэтому нужно подготовить население к изменениям в их жизненном укладе путем создания «информационных классов».***




**Т**акое заявление губернатор штата Кохедес Теодоро Боливар сделал во время приема группы белорусских архитекторов БелНИИП градостроительства в Сан-Карлосе.

– *Мы готовы создать информационные классы в 10 университетах Сан-Карлоса. Идея агрогородков найдет наибольшее понимание в умах молодого поколения, а молодежь – лучший дистрибьютор новых идей*, – сказал Теодоро Боливар.

Белорусские гости отметили эффективность ведения коллективного хозяйства, плюсы создания единой инфраструктуры в рамках агрогородков, которые получили успешное развитие в Беларуси с 2005 года.

– *Агрогородки в Беларуси зарекомендовали себя как наиболее эффективная форма возрождения села и привлечения в сельскую местность людей, которые не нашли применения своим силам в городе*, – подчеркнул замдиректора БелНИИП градостроительства Дмитрий Семенкевич.

## Рэалісты вучаць кітайскую

***Мода на кітайскую мову гэта не толькі беларускі феномен. Як аказалася, шмат хто з вільнюскіх школьнікаў жадаюць вывучаць кітайскі. У 9-ці сталічных школах 350 вучняў хацелі б, каб у іх школе быў кружок кітайскай мовы, а больш за 100 чалавек выказаліся за ўрокі кітайскай. Ну а калі такая справа, дык вільнюская мэрыя вырашыла даць сталічным школьнікам гэткую магчымасць.***

**З**араз у мэрыі разглядаецца магчымасць арганізаваць у школах кружкі кітайскай, якія маглі бы наведваць вучні 6–12 класаў. У 11-12-класнікаў будзе магчымасць вывучаць кітайскую на выбар (1-2 уроку ў тыдзень). У такім разе пасля сканчэння школы вучні змогуць па гэтым прадмеце атрымаць альбо залік/незалік, альбо адзнаку, якая патрапіць у атэстат.

Справа за драбязой – знайсці кваліфікаваных настаўнікаў. Службоўцы з мэрыі не губляюць аптымізму і ўпарта шукаюць адмыслоўцаў, якія маюць педагагічную адукацыю. Заняткі плануюць пачаць з 1 верасня 2010 года.

По материалам www.belta.by, www.inopressa.ru, www.lenta.ru, www. susvet.info

# ТАЙМ ФОР ЯНГ РЕСЕРЧЕР

***27–28 апреля в стенах Полоцкого университета проходила научная конференция молодых ученых. Отрадно понимать, что молодая наука в университете есть, и, тем более отрадно, что доклады конференции были подготовлены на английском языке.***

Сам факт, что событие стало ежегодным – греет душу. Но является ли этот факт прямым доказательством того, что уровень знания английского среди студентов достаточен для введения англоязычного образования в стенах ПГУ, вызывает большие сомнения. Да, уровень организации мероприятия вырос: добавились прямые трансляции из зала конференции в фойе обоих корпусов, появились красивые сумки у участников, да и ректор соприсутствовал на пленарном заседании конференции. Многие студенты прошли боевое крещение, выступив с докладами, пускай и выученными на зубок, но все же написанными на английском. Это все хорошо и даже прекрасно.




Однако, на мой скромный взгляд, в конференции отсутствовала главная составляющая – свободное и неформальное общение на темы докладов после заседаний на все том же английском языке. Хотя и на русском языке общения тоже не было. А раз нет общения, значит, нет интереса, значит, для многих это была просто формальность. Не наблюдалось большого присутствия иностранных представителей. По словам организаторов, эту недоработку исправят в следующем году.

Вообще, тема преподавания на английском языке актуальна для всей высшей школы и для нашего университета в частности. Но пока это не более чем красивая мечта. Не спорю, есть люди, которые хотели и могли бы преподавать на английском. Но много ли таких в нашем университете? Сомневаюсь. Понятное дело, что преподаватели ИФФ и кафедр иностранных языков не ставятся под сомнение. Для того, чтобы вырастить англоязычных как студентов, так и преподавателей, нужно слишком много сделать и хорошо постараться. А так, получается, что часы, отведенные на изучение иностранных языков, с каждым годом сокращаются, а программы для преподавателей закрываются. И необоснованно требовать от студентов, занимающихся в углубленных группах на платной основе, защиты дипломов на иностранном языке. Возможным выходом из ситуации могли бы стать иностранные профессора, которых бы приглашали с курсом лекций в наш университет. Удовольствие, правда, не из дешевых. Есть еще программы международного обмена, во многих из которых университет принимал участие. Но ведь сейчас такого нет. Ну и как развивать направление, и тем более требовать достижения результатов, если нет основы? Вот и остается проводить конференции с докладами, в 90 % случаев выученными наизусть, чтобы показать, в первую очередь самим себе, что не все так плохо в университете с английским – вон сколько студентов подготовились! А ведь все может сложиться иначе, если, конечно, признать, что не все так безоблачно и начать двигаться вперед.

***В. Лобов***

# ШКОЛЬНИКИ БОЯТСЯ УЧАСТВОВАТЬ В АКЦИИ БРСМ

***Брестские школьники боятся участвовать в акции БРСМ «Задай вопрос президенту». Об этом Еврорадио сообщила учительница одной из школ города. Акция началась 14 апреля, однако до сих пор в городе нашлось лишь 10 учеников, пожелавших задать вопрос президенту.***

**Учительница:** «Когда спрашиваю детей, какой вопрос они хотят задать президенту, то первая реакция почему-то смех. Я спрашиваю, почему они смеются. А они говорят: «А почему мы должны подписывать эти вопросы? Если бы можно было подписать вопрос псевдонимом, мы бы многое спросили, а своим именем подписывать не хотим. А вдруг нас посадят?»

Учителям даже пришлось специально попросить школьников поучаствовать в акции. В итоге те решили не задавать президенту вопросов, а обратились к нему с просьбами.

**Учительница:** «Пишут нам: «Уважаемый Александр Григорьевич! Я хотел бы к вам обратиться с просьбой обратить внимание на систему образования в нашей стране. Мы пришли в школу, была 11-летняя система и 5 баллов, потом 12 лет и 10 баллов». То есть за время обучения в школе они попали в три реформы образования, и чтобы такого больше не было». Один класс сказал: «Мы хотим попросить президента, чтобы он не убирал социальные сети, потому что без «В контакте» мы погибнем». То есть им главное – чтобы интернет не трогали, а все остальное, говорят, их устраивает. Однако это то, что они могут сказать. А адресность и авторство этих вопросов сразу «обрезает» их свободу слова».

***Па матэрыялах www.euroradio.fm***

# ПЕРШАМАЙ – БАРАЦЬБА ЗА ПРАЦУ

***Першае траўня традыцыйна адзначаецца ў Беларусі, як свята працы. Але што такое свята працы?***

**С**таражытныя кельты адзначалі ў гэты дзень свята агню. Падобныя святы былі і ў іншых народаў. Менавіта таму, спрабуючы выкараніць паганскія традыцыі, каталіцкая царква рашуча змагалася супраць гэтага свята, паставіўшы яго фактычна па-за законам. Але, будучы не ў стане перамагчы паганскія святы, царква ўдала падмяніла іх новымі. Гэта датычыцца і свята, якое адзначалася 1 мая.

Цікава, але гісторыя 1 мая пачынаецца ў Амерыцы з забастоўкі і дэманстрацыі чыкагскіх працоўных 1886 года. Становішча пралетарыяту ў тыя часы было вельмі складаным. Так, паводле дадзеных заключэння Бюро працоўнай статыстыкі ЗША, прадстаўленага Кангрэсу, сярэдні кошт жыцця складаў 720 даляраў на год, а сярэдняя зарплата працоўных – толькі 300, прытым працягласць працоўнага дня была 11–12 (часамі нават 15) гадзін. Адносіны дзяржавы да працоўных яскрава паказаныя ў выснове ў канцы гэтага заключэння: *«Людзі павінны паміраць, каб квітнела індустрыя»*...

1 мая ў Чыкага распачалася забастоўка з патрабаваннем усталявання 8-гадзіннага дня працы. У той час Чыкага быў цэнтрам працоўнага руху ў Амерыцы. Паліцыя атакавала забастоўшчыкаў, у выніку 6 працоўных загінулі. На наступны дзень адбылася грандыёзная дэманстрацыя. Тысячы працоўных выйшлі на вуліцы горада, каб запратэставаць супраць паліцэйскага насілля. Паліцыя была добра падрыхтавана да акцыі. Але нечакана ў натоўп паліцэйскіх паляцела бомба. Некалькі чалавек загінула. Улады горада Чыкага абвінавацілі ў тэрарыстычным акце актывістаў прафсаюзнага руху. У той час сярод прафсаюзных дзеячаў былі вельмі распаўсюджаны анархісцкія ўплывы. Гэтым і скарысталася пракуратура, каб прадставіць арыштаваных працоўных актывістаў, як мацёрых тэрарыстаў, плануючых з дапамогай бомбаў разбурыць ненавісную дзяржаўную машыну. Судовы фарс, які адбыўся некалькі месяцаў пасля, увайшоў у гісторыю як адна з ганебных плямаў на твары амерыканскага правасуддзя. Льюіс Лінг, Альбэрт Парсанс, Адольф Фішэр, Аўгуст Шпіс і Георг Энгэль былі прыгавораны да смяротнага пакарання. Прыгавор тэрмінова быў выкананы. У 1889 годзе паседжанне Першага Інтэрнацыяналу прыняло рашэнне адзначаць 1 мая як свята міжнароднай салідарнасці працоўных у барацьбе за свае правы. З таго часу і па сённяшні дзень – Першамай свята працоўных.




На тэрыторыі Расійскай Імперыі (у склад якой уваходзіла Беларусь (у тыя часы) гэта свята было ўпершыню адзначана ў 1890 годзе ў Варшаве 10-тысячнай стачкай. У гэты ж дзень дэманстрацыі і забастоўкі прайшлі ў Аўстра-Венгрыі, Бельгіі, Германіі, Іспаніі, ЗША, Нарвегіі, Францыі, Швецыі, Англіі (у нядзелю 4 мая). У 1891 годзе у Санкт-Пецярбургу прайшла першая маёўка, якую ўзначаліла сацыял-дэмакратычная група Бруснева, а з 1897 года свята пачынае адзначацца масава і набывае палітычны характар. У 1917 прайшло першае афіцыйнае святкаванне 1 мая, а ў 1990 – апошняе.

На працягу ўсёй гісторыі Першамай спрабавала выкарыстаць у сваіх мэтах дзяржаўная ўлада. У СССР, і нават у фашысцкай Нямеччыне, гэтае свята адзначалася з вялікім размахам за якім улада хавала поўную безабароннасць працоўных перад дзяржавай. Але і тады, і цяпер былі людзі для якіх Першамай заставаўся і застаецца тым, чым ён быў з самага пачатку, тым чым ён ёсць на самой справе – Святам Барацьбы. Вось чаму мільёны людзей па ўсёй планеце выходзяць у гэты дзень на вуліцы, удзельнічаюць у мітынгах і дэманстрацыях.

***Ульляна Полацкая***

# ВІНШУЙЦЕ ПА-БЕЛАРУСКУ!

***Мінскі дызайнер Раман Шык прапанаваў хіт сезону – беларускамоўныя паштоўкі.***

**Ц**ікава, што на момант з’яўлення ідэі сам аўтар быў чалавекам рускамоўным. Аднак новы праект так захапіў Рамана, што ён пачаў вывучаць родную мову.

– Акрамя сваёй асноўнай працы дызайнерам па рэкламе, у свабодны час я люблю маляваць штонебудзь вясёлае: коміксы альбо карыкатуры, – распавядае Раман. – Аднойчы мая знаёмая Аксана Бразевіч, майстар па манікюру, разглядала гумарыстычны часопіс з маімі малюнкамі. І раптам кажа: *«А давай рабіць паштоўкі на беларускай мове. Іх нідзе няма».*

Я задумаўся ўсяго на дзве-тры секунды, а потым выгукнуў: *«Ідэя – супер!»* Ідэя настолькі захапіла мяне, што ўжо праз некалькі дзён я выйшаў з гарвыканкама, трымаючы ў руках пасведчанне індывідуальнага прадпрымальніка. Праз месяц забраў невялікі тыраж з друкарні і пайшоў па крамах прапаноўваць сваю прадукцыю на рэалізацыю. Большасць адразу згадзіліся. Так паступова назбіраліся 23 гандлёвыя кропкі, у якіх мае паштоўкі прадаюцца.




На жаль, ёсць некалькі прадаўцоў, якія ўпарта не хочуць супрацоўнічаць. Кажуць, у іх дастаткова пастаўшчыкоў. *«Усе мае паштоўкі толькі на беларускай мове. Такіх яшчэ не было»,* – спрабую іх пераканаць. У адказ чую: *«А нам все равно.»*

Але я не збіраюся здавацца – буду перыядычна рабіць ім прапановы зноў і зноў, пакуль не згадзяцца.

***Па матэрыялах www.gazetaby.com***

# ПРИВЕТСТВУЕМ ВАС, ЛЮДИ БУДУЩЕГО!

***«Ну, здравствуй! Похоже, ты все так же «не оторвана» от цивилизации, если читаешь это письмо. А помнишь, как 20 лет назад, в нежном-пренежном возрасте хотела уехать жить на остров Бали, чтобы стать мягкой и пушистой?..»***

**О**днажды, когда мне было лет 18–20, я собрала свои самые милые письма юности, самые трогательные подарки раннего периода влюблённостей и вообще все нежности, связанные с отрочеством, и спрятала всё это очарование в коробку от обуви BELWEST, предварительно заклеив её скотчем по всему периметру, чтобы не было шансов вскрыть коробку раньше срока. А на коробке написано, что открыть её надо лет через 20-25 и не показывать содержимое детям…

Уже потом, став полноправным пользователем Интернет, открыла для себя нечто подобное, только более непредсказуемое – Письма из будущего. Ты пишешь сам себе письмо, ставишь срок его отправки до 30 лет и, соответственно, через 30 лет, успешно забыв об отправленном послании, получаешь себя самого с вопросом «Ну, как ты поживаешь моя ненаглядная старушка?». Непредсказуемое – потому что текст послания, как правило, забывается. Да и само проделанное действо за всей бытовой мелочью напрочь стирается из памяти.

Зачем это нужно? Кому-то хочется увидеть себя со стороны и, остановившись на момент, вспомнить молодость. Кто-то, получив забытое послание, возможно, поразмышляет над вопросом кем он был и кем стал и…впадет в депрессию, проведет переоценку ценностей, решит какой он молодец или еще что-нибудь в подобном роде.

Прошлое, настоящее и будущее можно рассматривать в нескольких плоскостях: горизонтальной – когда все разделено и есть только сейчас, или вертикальной – когда все три времени сливаются в определённой одной точке. Похоже, человек, да и человечество в целом, движется по вертикали, пытаясь увязать все периоды пережитого. Если Интернет даёт возможность поговорить с самим собой наедине через n-ое количество лет, то человек вообще пытается поговорить со своими потомками – настойчиво, всеми возможными способами, чтобы не забывали кто, когда и что творил! Это, знаете ли, такие глобальные письма будущего, когда в фундамент очень важного здания закладывают капсулу времени с посланием потомкам, содержащим, как правило, радужные мечты о светлом будущем, самые лучшие надежды и краткое описание ошибок настоящего.



Большинство населения постсоветских стран считает «Письма будущего» наследием СССР. Просто в Советском Союзе капсулы времени строительных трудовых коллективов пользовались особой популярностью. На Севере местные фермеры до сих пор находят на своих подворьях призывы рабочих 50-х, 60-х гг. прошлого века продолжать *«не жалея сил ударно строить коммунизм!»*. Но есть и абсолютно очаровательные примеры советских писем будущего. Так, в 1960 г. «Письмо в будущее» подписали 1200 артековцев из всех республик бывшего Советского Союза, затем его уложили в капсулу и запаяли в металлическую ракету, которая все 40 лет хранилась на Костровой площади Артека. А в 2000 г. на торжественной линейке ракету распилили и извлекли оттуда письмо. Тогдашние пионеры *«немного завидуют»* адресатам. Артековцы-шестидесятники предполагают также, что *«в СССР-2000 победил коммунизм, люди ежедневно летают на Луну и что, наверное, в Артеке уже есть свой космодром»*.

Последняя глобальная акция в стиле «а поговорю-ка я с потомком» – запуск в конце 2003 года 100-килограммового спутника КЕО, унесшего в космос послания жителей Земли будущим поколениям. Сообщения, которые на специальном сайте мог оставить любой желающий (все без купюр и без цензуры), будут путешествовать 50 тысяч лет. Предполагается, что, покрутившись на орбите 500 столетий, спутник каким-то образом вернётся на Землю: *«Если мы не наделаем глупостей, то будем существовать и более 50 тысяч лет, ведь это всего-навсего 1 % от всего срока жизни человечества на планете»,* – отметил Жан-Марк Филипп, один из организаторов кампании. Кстати, на резонный вопрос как потомки смогут прочесть сообщения, ведь все существующие проигрыватели к тому моменту устареют, организаторы ответили, что послания содержат и диаграммы при помощи простых символов объясняющие потомкам, как сделать DVD-плеер.

Возможно, что именно с помощью подобных писем, будущие «человеки» узнают о нас как о своих предках что-нибудь такое, чего никогда не сможет узнать их наука. Главное, написать что-нибудь хорошее и внятное, а то есть подозрения, что потомки и без наших посланий будут о нас весьма нелестного мнения…

***М. Озорова***

# НАКРЫЎКІ

***Нарэшце трэба прыкрываць вочы, каб не шчурыцца і каб галаву не напякло. Традыцыйна гэтую функцыю выконвалі галаўныя ўборы.***



Даўным-даўно жанчыны насілі наміткі і хусткі. Лічылася непрыстойным з'яўляцца на людзях проставаласай, то-бок з непакрытай галавой. Знакамітыя косы паказваліся толькі сваякам ці падчас святаў, ды і былі хутчэй варыянтам практычным, чым эстэтычным. Сяляне стрыгліся альбо пад гаршчок, альбо насілі даўгія валасы, шляхта таксама, але разпораз у штосьці накшталт бокса з чубом. У 17–19 ст. мужчыны зімой насілі аблавухі (дзівакаватыя вушанкі), а летам магеркі (шапкі цыліндрычнай формы з валенай аўчыны) белага колера і брылі (саламяныя капелюшы), потым шляпы.

Адзін мой сябра-аўтамабіліст кажа, што, калі ўбачыш на дарозе нейкага тупарэза, то амаль 100 % ён будзе за стырном у шапцы. У прынцыпе, інфармацыя пацвярджаецца асабістым досведам. Нашыя закамплексаваныя суайчыннікі, відаць, спрабуюць шапкамі адмежавацца ад света і абараніць галаву. Таму едуць, уцапіўшыся ў руль, як у танку і, само сабой, тармазяць па сітуацыі. У савецкі час нашыя землякі пачалі насіць мехавыя (пыжыкавыя) накрыўкі розных фасонаў і мадыфікацыі канфедэратак (казырок і авальная цыліндрычная тканая ці дзермацінавая тулія). Пьяныя і тлустыя суайчыннікі дыскрэдытуюць саму ідэю модных і прыгожых убораў. Канфедэраткі – гэта наш, цэнтральнаеўрапейскі ўнёсак у мадыфікацыі галаўных убораў. Пачала іх насіць шляхта недзе ў 16 ст., называючы батарыянкамі – у гонар С. Баторыя. У канцы XIX ст. яны перарадзіліся ў картузы (фуражкі) і пехотныя шапкі ЗША, і далей паўсюль.

Увогуле, галаўныя ўборы былі ва ўсіх культурах і змяняліся разам з імі. Лічыцца, што самай распаўсюджанай накрыўкай галавы ў Еўропе эпохі Сярэднявечча і Адраджэння былі бэрэты – вынаходніцтва баскаў (прыгадаем мастацтва і нават партрэты Ф. Скарыны), і каптуры (сеткі-шапкі для валосаў). Кацялкі, цыліндры і шляпы далі чалавецтву англасаксонцы вышэйшых слаёў грамадства, кепкі – брытанскія пралетарыі, каўбойскія шляпы-стэтсаны і бейсболкі вынайшлі простыя амерыканцы.

Галаўныя ўборы былі і з'яўляюцца статуснымі прадметамі, але, канешне, дэмакратызацыя культуры садзейнічае распыленню і змяненню граніц сацыяльных груп, якія іх ужываюць. Кожны фасон звязаны з пэўным вобразам-стэрыятыпам у нашай свядомасці. Але прыгадаем шэраг кантэкстаў у творах мастацтва, дзе ўзгадваюцца галаўныя ўборы. У Маркеса нейкі стары павучаў сынка *«ты можаш быць без парткоў, але калі ты ў шляпе – ты сеньёр».* Стэрыятып бэрэта або ваяка, або мастакі-французы, ці дзевачкі-гімназісткі. Прыгадайце эратычны кацялок Сабіны з «Нязноснай лёгкасці быцця» – зараз класічны ў партфалійных вобразах мадэлек. Ці шляпкі Шанэль і іншых марак на паненках у класічных фільмах і карцінах, а, увогуле, жанчына калісьці магла зрабіць шляпку з нічога…

Падаецца, галоўнае ў выбары ўбора – як ты сябе адчуваеш сёння: на нейкага каўбоя, мастака, калгасніка ці пана. Аднак, трэба, каб накрыўка вашай галавы пасавала да твара і вашага ўмення насіць яе, не сядзела на галаве як на карове сядло. Напрыклад, кепку ці шляпу джэнтэльмены не камбінуюць з даўгімі распушчанымі валасамі. Бейсболка, пехотная канфедэратка ці кепка – дэмакратычныя ўборы, шляпы –арыстакратычныя. Галаўныя ўборы носяцца на палец-два вышэй брывей, але заўсёды кепскі тон цягаць іх на цемечцы. Падбірай і хадзі не парся.

**Wowжжык**

# ВАЛЯНТАРЫЯТ У АЎСТРЫІ

***Цэнтар Карытас з гораду Leonding (Аўстрыя) шукае валянтэраў ва ўзросьце 18-30 год, якія валодаюць нямецкай мовай на размоўным узроўні, на тэрмін 6 месяцаў з 1 верасьня 2010 году па 1 сакавіка 2011 году.***

**Ц**энтар Карытас St. Isidor зьяўляецца па сваіх памерах невялікай вёскай са сваёй інфраструктурай, рознымі дэпартамэнтамі й будынкамі, такімі як амбулаторны цэнтар, 3 школы, жылыя будынкі, касьцёл і г.д. Валянтэр зможа працаваць з рознымі групамі й пэрсаналам розных будынкаў, і такім чынам даведаецца болей пра дзяцей з мэнтальнымі й фізычнымі абмежаванасьцямі, ды як можна зь імі працаваць.

**Апошні тэрмін падачы заявак: 10 траўня 2010 году.**

Больш інфармацыі пра дзейнасць у праекце можна прачытаць на старонцы:

http://ec.europa.eu.

Праекты фінансуюцца за кошт праграмы Эўразьвязу «Моладзь у Дзеяньні», акцыя 2 «EVS».

***Паводле рассылкі belngo.info***

## Запісы ў нататніку Манэ

Урыўкі



***

Ёсьць усё ж такі рэчы, якія немагчыма прабачыць. Дзіўна – асэнсоўваеш іх значнасьць, агіднасьць, страшэннасьць далёка не адразу. Тады тое ўжо не падаецца злаcьлівым. «Я табе гэта прыпомню», – кажуць у маёй вёсцы. Крыўда – тое ж зло – лезе глыбока ў нутро. Пэўна, трэба ўмець прабачаць. А таксама даіць карову і страляць з аўтамату.

***

Любоў і каханьне – рэчы спрэчныя, самастойныя, ды не заўсёды ўзаеманеабходныя. Часьцей жа любіш, бо кахаеш. Спрэчна кахаць – бо любіш. Ці можна закахацца ў чалавека, якога любіш? Каханьне, падмацаванае любоўю – самае моцнае, працяглае ды сьвежае.

***

Пытаньне на мой адказ ведае, што мне лепш яго ня ведаць.

***

Мама кажа: ня пі кавы. І не дае піць. А сама п'е. П'ю каву – у кавярні, у сябра Сашкі, у бабулі. І бабуля кажа – ня пі кавы. А сама п'е. ды мне дае. Кажа, часам можна. Абураецца, што мама не дазваляе. Кажа, што мама шкадуе. Бо сама ж п'е. А мне не дае. Кажа: ня пі кавы… Забыць Герастрата.

***

У метро гляджу людзям у вочы. Доўга й нахабна. Людзі ловяць мой позірк ды тут жа ўхіляюць уласны. Гляджу людзям у вочы – ашукваю сам сябе.

***

Ня хочацца пісаць пра каханьне, бо – не накахаўся яшчэ.

### Глеб Лабадзенка

Нарадзіўся ў 1986 годзе ў Менску.

Скончыў Коласаўскі ліцэй і журфак БДУ. Дзясяты год працуе журналістам, столькі ж піша вершы. За гэты час напісаў больш за 1100 матэрыялаў. У 2005 годзе выдаў кнігу паэзіі «Pager-вершы».

За мінулы год засьвяціўся як арганізатар некалькіх культурніцка-сацыяльных акцыяў – візыт Радзівілаў у Беларусь, выданьне дыску «Галасы», набыцьцё пліты для Валянціны Быкавай, усталяваньне помніка на магіле бабулі Ўладзімера Караткевіча. Апошнія ініцыятывы – беларусізацыя ўнікальнай электроннай энцыкляпэдыі беларускай архітэктуры «Глобус Беларусі», выданьне факсыміле рукапісу «Ладзьдзі Роспачы» Ўладзімера Караткевіча.

# НЕНУЖНАЯ СТАТИСТИКА

***По официальным данным, с явкой на выборы в местные Советы депутатов было все отлично. Вопрос о прозрачности выборов в Беларуси волнует, пожалуй лишь, представителей ОБСЕ. Коренные жители либо спокойно-равнодушны, либо шушукаются, либо работают-учатся. Наши статисты решили стать отголоском выборов, озадачив студентов вопросом:***

**ПОЧЕМУ ВЫ ГОЛОСОВАЛИ НА ВЫБОРАХ?**




1 – я не голосовал

2 – вы, наверное, не живете в общежитии

3 – все пошли, и я пошел

4 – это мой долг

**И**так, треть опрошенных откровенно намекнули на связь проживания в общежитии и участия в выборах. 14 % посчитали голосование своим долгом, а более 50 % опрошенных в выборах не участвовали. Для повышения участия молодого поколения Новополоцка в будущих выборах, предлагаем ввести систему маркетинговой пирамиды: каждый из самых ответственных приводит по 2 штуки безответственных, но уже готовых правильно голосовать и получает бонус – еще один бюллетень… или два…ну, кому как захочется. И тогда станет понятно и откуда цифры на выборах берутся, и кто будущее Беларуси строит.

## СУМНА?

– Жора, а што ў цябе ў кішэні?

– Самыя непатрэбныя рэчы: прэзерватыў і рэзістар на 4,7 кОм. Прычым рэзістар больш патрэбны…

***

Чым падобныя міліцыянт і жанчына? Тым, што ў абоіх форма важнейшая за змест.

***

Аднойчы малыш атрымаў у падарунак цацачную зенітную ўстаноўку. Гэта карэнным чынам змяніла жыццё Карлсана.

***

– Дзяўчыны, а вы ніколі не думалі, чаму на кнопцы «паўза» дзве палоскі?

**Наклад: 299 ас. бясплатна**

Заснавана ў 2004 годзе. Выдаецца на правах рукапісу.
Думкі аўтараў могуць не супадаць з нашым уласным меркаваньнем.
Матэрыялы падаюцца на мове аўтараў.
**Харошыя людзі:** М.Азарова, Н.Сарокіна, В.Лобаў, В.Сублім.
**www.makasin.info** | **e-mail:** hazeta@gmail.com |
Надрукавана на асабістым абсталяваньні